таздымках, малюнках, інфаграфіцы. Аднак часам не захоўваецца баланс: ілюстрацыі могуць размяшчацца нераўнамерна, зрэдку нават адсутнічаць у дастаткова ўборыстым тэксце. Дасягненнем новай «Народнай газеты» можна лічыць сістэматычнае выкарыстанне друкарскіх шрыфтоў, добра ўспрымальных і чытабельных, не дэкаратыўных у адрозненне ад былой версіі. Мінусам кантэнту застаецца нявызначанасць статусу беларускай мовы, якая амаль не прадстаўлена ў выданні, аднак заяўлена ў фармаце і лозунгу «Жыве Беларусь!» на перадавіцы.

Такім чынам, адзначым, што, нягледзячы на актыўнае развіццё вэб-рэсурсаў, друкаваныя выданні маюць цудоўныя магчымасці для мадэрнізацыі дзейнасці, трансфармацыі канцэпцыі і палітыкі выдання. Той факт, што сёння газета не лідар у аператыўнасці і інфармаванні, павінен прывесці да аператыўнай змены тэматычна-зместавых і візуальна-графічных прыярытэтаў. Дапамагчы друкаваным СМІ дастойна канкурыраваць у час жорсткіх эканамічных умоў, што ўжо вынікавалі працэсы рэарганізацыі ў беларускай медыяпрасторы, павінны прафесійныя медыяменеджары.

*Літаратура*

1. Вартанова, Е.Л. Движущие силы развития медиабизнеса / Е.Л. Вартанова // Elena Vartanova’s Personal Website [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://vartanova.ru/articles/ru/glava3.html. – Дата доступу: 20.01.2015.

**Таццяна Падаляк**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

## АКСІЯЛАГІЧНЫЯ ДАМІНАНТЫ АСВЯТЛЕННЯ ВАЕННА-ГІСТАРЫЧНАЙ ПРАБЛЕМАТЫКІ Ў СМІ

Сродкі масавай інфармацыі аказваюць істотны ўплыў на фарміраванне маральных арыенціраў, вызначэнне аксіялагічных прыярытэтаў соцыуму. Значным фактарам уздзеяння на каштоўнасныя ўстаноўкі аўдыторыі масмедыя з’яўляецца ваенна-гістарычная тэматыка. Узровень яе асэнсавання і асвятлення непасрэдна залежыць ад аксіялагічнай скіраванасці журналіста і рэдакцыі СМІ. Гэта звязана з тым, што ў працэсе некарэктнай журналісцкай інтэрпрэтацыі (як па аб’ектыўных, так і па суб’ектыўных прычынах) праўда факта можа стаць лжэфактам праўдападобнасці – а значыць, медыяфальсіфікацыяй гісторыі.

Нягледзячы на вялікі аб’ём рознаскіраваных і шматвектарных даследаванняў Вялікай Айчыннай вайны, ліквідаваны далёка не ўсе «чорныя плямы» гісторыі. Толькі ў пачатку XXI ст. журналісты ўзнялі пытанне аб нацысцкай правакацыі: штучна ствараемых спецыяльных атрадах абвераўскіх карнікаў пад шыльдай партызанскіх атрадаў – з мэтай дыскрэдытацыі партызанскага руху.

Ілжэпартызанскія атрады – феномен гэты не быў распаўсюджанай з'явай. Тым не менш распрацоўшчыкі фальшыўкі дасягнулі пастаўленай мэты – нанесці шкоду рэпутацыі партызанскага руху, у негатыўным святле прадставіць патрыятычнае супраціўленне ворагу. Як аказалася, ініцыятары стварэння лжэпартызанскіх атрадаў, вырашаючы аператыўныя задачы, нібыта глядзелі і на перспектыву, дэманструючы здольнасць прадбачання. З другой паловы 1990-х гадоў, калі пачала нарастаць хваля пераацэнкі партызанскага руху, выявілася нямала ахвотных паставіць знак роўнасці паміж партызанамі і лжэпартызанамі. З-пад «лёгкага пяра» асобных гісторыкаў, літаратараў і журналістаў вылятаў «сенсацыйныя адкрыцці»: быццам бы партызанскія атрады былі «сапраўднымі бандамі», партызаны – «бандытамі» і ўвогуле на партызанскай вайне «ўладарыў маленькі князёк». Лейтматыў: гэтай старонкі мінулага трэба саромецца.

Падмена паняццяў – рэч надзвычай небяспечная і для гісторыі, праўды жыцця народа, і для каштоўнаснай сістэмы каардынат грамадства. Нямецка-фашысцкія акупанты называлі партызанаў бандытамі, наконт гэтага меліся адпаведныя ўказанні. Названыя бандытамі партызаны, па задуме нацыстаў, пазбаўляліся статусу барацьбітоў за вызваленне сваёй роднай зямлі. Аднак як зразумець, чаму ў Беларусі, праз дзесяцігоддзі пасля Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, бярэцца на ўзбраенне падобная лексіка? Парадокс, нонсэнс, элементарнае няведанне гісторыі – або наўмысная спроба перапісаць, «пераліцаваць» гісторыю?

Дакументы сведчаць: найменне «бандыт» мала дапамагала гітлераўцам у памкненні скарыць, паставіць на калені патрыятычна скіраваны народ. У дырэктыве Гітлера № 46 «Аб узмацненні барацьбы з бясчынствам банд на Усходзе» ад 18 жніўня 1942 г. шырокі размах партызанскага руху прызнаваўся сур'ёзнай пагрозай для забеспячэння фронту і эканамічнага выкарыстання акупаванай тэрыторыі. У дадатку да гэтай дырэктывы 18 кастрычніка 1942 г. Гітлер указаў, што партызанская вайна прывяла да празмерна цяжкіх страт у баявой магутнасці і толькі там, дзе барацьба супраць партызан праводзілася з бязмежнай жорсткасцю, з'явіліся поспехі. На падставе гэтага ён рабіў выснову, што ва ўсёй усходняй вобласці барацьба супраць партызан з'яўляецца барацьбой за канчатковае знішчэнне аднаго з бакоў. У сувязі з гэтым у дакуменце «Аб барацьбе з бандамі на Усходзе» ад 11 лістапада 1942 г. рэкамендавалася: палонныя павінны расстрэльвацца на месцы пасля кароткага допыту; кожны камандзір падраздзялення адказвае за тое, каб палонныя бандыты і грамадзянскія асобы, захопленыя пры выкананні актыўных дзеянняў (уключаючы жанчын), былі расстраляныя або, што яшчэ лепш, павешаны; супраць вёсак, у якіх банды знайшлі любую падтрымку, ужываць, як правіла, калектыўныя меры – у залежнасці ад цяжкасці злачынства, яны могуць заключацца ў павелічэнні нормаў здачы, канфіскацыі часткі або

ўсяго пагалоўя жывёлы, адпраўцы жыхароў для працоўнага выкарыстання ў Германію і нават знішчэнні ўсёй вёскі [2, с. 34].

Жорсткасць барацьбы была ў такім напале, што немцы пайшлі на правакацыю: пачалі ствараць ілжэпартызанскія атрады. Называлі іх «фальшывымі бандамі», «ілжэбандамі». Падрабязнаму аналізу гэтай з’явы прысвечаны артыкул «Пераліцоўка. Ілжэпартызанскія атрады «працавалі» па схеме, зададзенай ворагам», змешчаны ў газеце «Звязда» 6 і 7 ліпеня 2004 г. Публікацыя грунтуецца на захаваных у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь нямецкіх дакументах, якія адшукала гісторык Р.А. Чарнаглазава. «**Для высвятлення адносінаў насельніцтва да партызанаў** (тут і далей выдзелена мной. – **Т. П.**) з поспехам дзейнічала «фальшывая банда». Насельніцтва спрыяльна аднеслася да банды і нават прапанавала ёй падтрымку», – адзначана ў аглядзе нямецкімі ўладамі партызанскага руху за перыяд з 01.07.1942 па 30.04.1943 гг. (Звязда, 06.07.2004).

У якасці медыяэксперта па абазначанай тэме выступіў адзін з арганізатараў партызанскага руху ў Беларусі Эдуард Баляслававіч Нордман. З чэрвеня 1941 па ліпень 1944 года (1119 дзён і начэй) ён змагаўся ў тыле ворага, у партызанскім атрадзе В.З. Каржа: радавы, камандзір аддзялення разведкі, памочнік камісара атрада, потым брыгады па камсамоле; пра дзёрзкія партызанскія аперацыі з яго ўдзелам хадзілі легенды. Э. Нордман удакладніў: распрацаваны план Барбароса быў разлічаны на «маланкавую» вайну, немцы не чакалі, што ў Беларусі ўзнікне магутны і маштабны рух супраціўлення, таму ніякіх сур’ёзных планаў у сувязі з гэтым у іх не было. «Немцы спрабавалі змагацца з партызанамі нават дывізіямі – не атрымлівалася. У другой палове 1942 г. яны пайшлі па шляху стварэння лжэпартызанскіх атрадаў. Гэта была не масавая з’ява. Аднак для нас, партызанаў, гэта стала сапраўдным галаўным болем. І вось чаму. Прыходзіць гэты псеўдапартызан ноччу ў вёску і пачынае рабаваць людзей. Пад выглядам партызана! У нас у атрадзе была строгая дысцыпліна, Корж папярэджваў: мы ваюем за народ, ніколі не крыўдзіце мужыка. <...> Зімой 1942–1943 гадоў, у час моцнай блакады, людзі галадалі. З’елі ўжо амаль усіх коней. У катлах варылі скуру – каб хоць нешта пажаваць... І вось у гэты час да Каржа прыйшоў селянін – паскардзіўся, што адзін з партызанаў знішчыў вуллі… За парушэнне загаду не браць нічога самавольна ў насельніцтва Корж сам расстраляў марадзера перад строем. Жорсткая дысцыпліна была! А калі прыходзіць псеўдапартызанскі атрад – у іх чырвоная палоска, «зорачка» на шапцы. І яны рабуюць... Змагацца з імі было складана» (Звязда, 06.07.2004).

Варта згадаць у сувязі з гэтым: галоўнае камандаванне сухапутных войскаў вермахта, генеральны штаб сухапутных войскаў, разведаддзел генеральнага штаба «Усход» 3 мая 1943 г. выдалі дакумент пад грыфам «сакрэтна» – спецыяльны дадатак да зводак аб партызанскім руху. «З вопыту выкарыстання лжэ-банд. Ілжэбанда ў колькасці 71 чалавека, у тым ліку 60

чалавек з міліцыі і паліцыі, была аснашчана рускай зброяй і амуніцыяй. **Яе задачай была праверка асоб, па-сяброўску настроеных да бандытаў**, або тых, хто з'яўляецца бандытам, а таксама асоб, гатовых далучыцца да бандаў. Ілжэбанду цёпла і па-сяброўску прымала насельніцтва вёскі. Банда не выклікала падазрэнняў у мясцовых жыхароў. Адна жанчына вельмі шкадавала, што яе муж уцёк, бо лічыў банду венгерскай. Яна прапанавала бандзе свайго каня. Іншыя жыхары выказалі гатоўнасць пайсці добраахвотнікамі, каб аказаць дапамогу «братам». Большасць жыхароў жадала найхутчэйшага вяртання чырвоных. **Дзякуючы дзейнасці лжэбанды ўдалося абясшкодзіць асоб, якія па-сяброўску адносяцца да бандытаў, і ў гэтым быў яе поўны поспех»** (Звязда, 07.07.2004). Дакумент дае падставу яшчэ раз звярнуць увагу на тое, што партызанская вайна – гэта барацьба і гібель людзей, якія не атрымлівалі загаду ваяваць: гэта было супраціўленне акупантам добраахвотнікаў.

Дзейнасць псеўдапартызанскіх атрадаў – мала даследаваны ракурс вайны, які высвечвае і тлумачыць сэнс і прызначэнне «навацыйных адкрыццяў» фальсіфікатараў гістарычнай праўды.

У часопісе «Беларуская думка» ў 2014 годзе апублікаваны цікавы артыкул даследчыка Алены Паўлавай «Шматграннасць усенароднай барацьбы. Адносіны партызанаў з мясцовым насельніцтвам», у якім падкрэсліваецца: «Дакументы архіваў сведчаць, што акупацыйныя ўлады стваралі лжэпартызанскія атрады. Каб правяраць насельніцтва на лаяльнасць, нямецкія салдаты і паліцэйскія пераапраналіся ў форму чырвонаармейцаў або прыкідваліся партызанамі. Праз ілжэпартызанаў захопнікі імкнуліся скампраметаваць сапраўдных партызанаў перад мясцовым насельніцтвам. Маюцца звесткі аб дзеяннях такіх падраздзяленняў у Баранавіцкай, Брэсцкай, Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях» [3, с. 84–85].

Такім чынам, гітлераўцы пайшлі на правакацыю, каб барацьба з партызанамі стала больш эфектыўнай. А ўвогуле прыём «пераліцоўкі» не быў выключным вынаходніцтвам нацыстаў на тэрыторыі Беларусі, ім карысталіся варагуючыя бакі на працягу ўсёй гісторыі існавання чалавецтва. Беларускія партызаны таксама не адмаўляліся ад метаду «маскі»: пераапраналіся пад немцаў, паліцаяў, каб паспяхова змагацца з ворагам. В.З. Корж, напрыклад, згадваў аперацыю, распрацаваную восенню 1941 года, па разгроме паліцэйскіх гарнізонаў у вёсках Заброддзе, Чырвонае Возера і Осава: «Перад разгромам гэтых гарнізонаў штабам быў распрацаваны наступны план: партызан-камсамолец Нордман павінен быў выступіць у ролі нямецкага каменданта, некалькі байцоў атрада – у ролі паліцэйскіх, а я – у якасці перакладчыка ў «каменданта» Нордмана. Уся група павінна ўвайсці ў вёску, узяць солтыса і пад выглядам мабілізацыі паліцэйскіх на барацьбу з партызанамі абяззброіць іх» [1, с. 216]. Нордман, выкрываючы

асобныя нямецкія словы, бліскуча сыграў ролю камenданта, а Корж – ролю перакладчыка; аперацыя партызанаў завяршылася паспяхова.

Вялікая Айчынная вайна – своеасаблівы аксіялагічны індыкатар і ў пэўным сэнсе «гістарычная падсветка» сучаснасці. Пераліцоўшчыкі праўды вайны, у тым ліку гераічнага народнага супраціўлення і партызанскага руху, наўмысна ці не, замоўчваюць яшчэ адзін надзвычай важны і актуальны факт. Як сведчаць дакументы, у мэтах глыбокай разведкі праціўнік рыхтаваў «масавую агентуру для насаджэння на пасляваенны перыяд у пакідаемых немцамі абласцях і для пранікнення ў глыбокі тыл СССР праз партызанскія атрады і брыгады» (Звязда, 07.07.2004). Вайна, нібыта жорстка-беспамылковы індыкатар, выявіла вяршыні чалавечага духу, маральную моц народа, героіку патрыятызму, а з другога боку – нізасць чалавечага грэхападзення.

*Літаратура*


1. Из истории партизанского движения в Белоруссии (1941–1944) : сб. воспоминаний / под ред. И.С. Кравченко [и др.]; Ин-т истории АН БССР, Белорусский гос. музей истории Великой Отечественной войны. – Минск: Госиздат БССР, 1961. – 506 с.
2. Лёшин, М. Преступления вермахта против военнослужащих Красной Армии и советских партизан / М. Лёшин // Истребительная война на востоке. Преступления вермахта в СССР. 1941–1944. Доклады. Под ред. Габриэле Горцка и Кнута Штанга. Серия «АИРО – научные доклады и дискуссии. Темы для XXI века». Выпуск 18. – М.: АИРО, 2005. – С. 25–39.
3. Павлова, Е. Многогранье всенародной борьбы. Отношения партизан с местным населением / Е. Павлова // Бел. думка. – 2014. – № 2. – С. 82–91.



**Людмила Петрова**

*Белорусский государственный технологический университет*


## МАРКЕТИНГОВЫЕ ИССЛЕДОВАНИЯ ПЕРИОДИЧЕСКИХ ИЗДАНИЙ

В Республике Беларусь осуществляется выпуск следующих периодических изданий про писателей Беларуси: журналы «Роднае слова», «Полымя», «Маладосць», «Літаратурная Беларусь», газета «Літаратура і мастацтва», журналы «Неман», газета «Слово писателя» (издаются на русском языке).

Рассмотрим подробнее данные издания. Журнал «Роднае слова» был основан в 1987 году как ежемесячное научное и методическое издание для учителей белорусского языка и литературы. В журнале представлены статьи по белорусскому языку и литературе, литературные портреты, олимпиадные задания, сценарии к юбилейным датам писателей, памятным дням и праздникам страны, статьи про художественные полотна, музыкальные произведения, которые посвящены писателю, кинофильмы и спектакли, созданные по его книгам.